# ДАСЛЕДАВАННЕ ДЗЕЙНАСЦІ СТАНІСЛАВА АЎГУСТА ПАНЯТОЎСКАГА: СУЧАСНАСЦЬ І ПЕРСПЕКТЫВЫ

**А. Я. Ляскоў**

Апошні кароль Рэчы Паспалітай – Станіслаў Аўгуст Панятоўскі – трывала займае ў свядомасці польскага грамадства і ў польскай гістарыяграфіі пазіцыю антыгероя. Яго характарызуюць як «бязвольную марыянетку Расіі», «нікчэмнага чалавека», а гісторык канца XIX ст. Валяр'ян Калінка называе караля не інакш як «здраднікам і злачынцам» [4, с. 136].

Калі ў 1938 г. савецкія ўлады вырашылі перадаць з Ленінграда парэшткі Станіслава Аўгуста Польшчы, то месцам пахавання Панятоўскага стаў не каралеўскі замак Вавель у Кракаве і нават не адзін з варшаўскіх касцёлаў, а бажніца ў глыбока правінцыйным Воўчыне (цяпер – Камянецкі раён Брэсцкай вобласці), дзе ў 1732 г. нарадзіўся будучы кароль.

Прычыны такога стаўлення палякаў да асобы Станіслава Аўгуста, як кажуць, ляжаць на паверхні – Панятоўскі не змог супрацьстаяць заняпаду Рэчы Паспалітай і яе падзелам паміж магутнымі еўрапейскімі імперыямі. Больш за тое, ён вымушаны быў падпісаць адпаведныя прававыя акты. Адзін з сучасных аўтараў піша з гэтай нагоды наступнае: «Кароль – няшчасная ахвяра абставінаў, міжволі бачыцца яго падабенства з Людовікам XVI. Чытаючы дамову пра другі падзел, Станіслаў Аўгуст заплакаў, молячы палкоўніка Штольтэнберга: «Міласцівы спадар, міласцівы спадар, злітуйцеся нада мной! Няхай не прымушаюць мяне падпісвацца пад сваёй ганьбай!» «Падпісвай» [5, с. 274].

У беларускай гістарыяграфіі цікавасць да апошняга караля Рэчы Паспалітай і апошняга Вялікага князя ВКЛ ляжыць збольшага ў плоскасці апалагетыкі яго нібыта беларускага паходжання. Такі падыход, на наш погляд, з'яўляецца абсалютна нармальным і прымальным. Ён можа разглядацца як пачатковы этап вывучэння дзейнасці Панятоўскага ў кантэксце фарміравання ўласна беларускай навуковай традыцыі.

Так, прафесар І. А. Юхо адзначае: «У верасні 1764 г. на элекцыйным сойме каралём Рэчы Паспалітай быў абраны ўраджэнец Беларусі <…> стольнік Вялікага Княства Літоўскага Станіслаў Панятоўскі, пляменнік канцлера Вялікага Княства Літоўскага Міхаіла Фрэдэрыка Чартарыскага» [6, с. 214].

Першая частка артыкула прафесара А. П. Грыцкевіча, прысвечанага Станіславу Аўгусту, так і называецца – «Паходжанне». Аўтар паказвае ў тым ліку сувязь прадстаўнікоў роду Панятоўскіх з нашай краінай. Напрыклад: «У XVIII стагоддзі і пазней хадзілі чуткі, што Панятоўскія з дробнай беларускай шляхты». І далей – пра беларускую лінію роду Панятоўскіх: «Нікадэм Тадэвуш Панятоўскі меў ганаровы тытул (праўда, нязначны)

чэсніка мсціслаўскага на пачатку XVIII стагоддзя <…> Потым гэтая галіна роду пасялілася на Украіне. Але прадстаўнікі галіны засталіся на Беларусі і яшчэ на пачатку XX стагоддзя жылі ў Смаленскай і Магілёўскай губернях» [1, с. 4].

Адзін з найбольш аўтарытэтных даследчыкаў беларускага грамадскага жыцця ў XVIII ст., прафесар А. І. Мальдзіс, падкрэслівае, што дзед караля Станіслава Аўгуста прынцыпова пісаў сваё прозвішча праз «у нескладовае» [2, с. 106].

Пры гэтым трэба адзначыць, што пытанне паходжання ці, дакладней, этнічнай і палітычнай ідэнтыфікацыі, было актуальным для грамадства Рэчы Паспалітай «абодвух народаў» у эпоху Асветніцтва.

Жыхары ВКЛ адчувалі сваю этнічную розніцу з палякамі. У XVIII ст. «перажыванне» адметнасці нават узрасло, тэрыторыя Вялікага Княства часта супрацьпастаўлялася Польшчы. На гэтую акалічнасць неаднаразова звярталі ўвагу замежныя падарожнікі. Так, напрыклад, немец Вільгельм Шлемюлер, які ў 1752 г. знаходзіўся ў Гродне, запісаў у сваім дзённіку: «Амаль заўсёды і пры кожным выпадку даецца заўважыць спаборніцтва паміж палякамі і літвінамі» [7, с. 31].

Не заставаўся абыякавым да развіцця ўзаемаадносін Польшчы і ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай і Станіслаў Аўгуст Панятоўскі. Ён пакідае ў сваіх «Мемуарах» важнае сведчанне пра супрацьстаянне (у першую чаргу – палітычнае) Кароны і Вялікага Княства: «Тое, што адбывалася ў той час у Літве, нагадвала карціны, якія ўзнікаюць пры чытанні гісторыі Шатландыі перад далучэннем яе да Англіі» [3, с. 284]. Заўважым – больш чым празрыстая алюзія на меркаваную будучыню Княства.

Самая надзейная крыніца – усё тыя ж «Мемуары» – паказваюць нам Станіслава Аўгуста як гарачага польскага патрыёта. Больш за тое, не выклікае сумненняў, што ён атаясамліваў Рэч Паспалітую з Польшчай, лічыў яе выключна польскай дзяржавай. Гэтая думка праходзіць скрозь увесь аўтабіяграфічны тэкст «Мемуараў».

Можна выказаць меркаванне, што такая пазіцыя караля істотна паўплывала на тое, што Канстытуцыя Рэчы Паспалітай 3 мая 1791 г. (важнейшы прававы акт і сімвал прагрэсіўных рэформ) абвяшчалася толькі ад імя палякаў. У Канстытуцыі нават не ўзгадвалася пра ВКЛ. Вядома, што Станіслаў Аўгуст Панятоўскі быў сярод аўтараў Канстытуцыі і нават склаў прэамбулу да яе.

У той жа час было б памылковым бачыць караля гэткім «літвафобам». Наадварот, Панятоўскі меў пэўны «сантымент» да краіны свайго нараджэння і да народаў, якія яе насялялі. Аб гэтым сведчаць наступныя факты. Так, пры наведванні Нясвіжа Станіслаў Аўгуст звярнуўся да Радзівілаў з вершаваным тостам па-беларуску: «Пане гаспадару, каж віна даці, што б у

твоей хаці ліха не знаці». Падобная сітуацыя была і ў час пездкі караля па Піншчыне, калі яго ўсюды сустракалі надпісамі на чатырох мовах – польскай, лацінскай, яўрэйскай і «рускай» [2, с. 90]. Узгадаем таксама, што пасля падзелаў Рэчы Паспалітай кароль абраў спачатку месцам свайго пражывання (пад наглядам генерал-губернатара М. В. Рапніна) Гродна – горад, які шмат у чым быў абавязаны сваім росквітам менавіта Станіславу Аўгусту. Менавіта там, у Новым замку, Панятоўскі і адрокся ад прастола.

Аднак перспектывы вывучэння навукай гісторыі дзяржавы і права Беларусі дзейнасці Станіслава Аўгуста Панятоўскага звязаны ўсё ж такі не з праблемай ідэнтыфікацыі, а, у першую чаргу, з яго прававымі, палітычнымі і культурніцкімі ініцыятывамі.

Абраны на прастол Рэчы Паспалітай пасля разбуральнага панавання саксонскай дынастыі Станіслаў Аўгуст адразу зарэкамендаваў сябе ў якасці рэфарматара. Яшчэ на канвакацыйным сойме 1764 г. групоўка пад назвай «фамілія», прадстаўніком якой быў Панятоўскі, забяспечыла правядзенне шэрагу рэформ дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай. У прыватнасці, быў устаноўлены новы парадак правядзення сойма, накіраваны на звужэнне магчымасцяў зрыву яго работы. Прымяненне права liberum veto абмяжоўвалася тым, што рашэнні па эканамічных пытаннях прымаліся простай большасцю галасоў. Было рэарганізавана ўпраўленне фінансамі, дзеля чаго ўтвараліся скарбовыя камісіі – каронная і ВКЛ. Былі таксама скасаваны так званыя «партыкулярныя» падаткі, якія збіраліся на карысць магнатаў, і ўводзіўся генеральны падатак, які мусілі плаціць усе шляхціцы. Рэарганізацыі падверглася і вайсковае ведамства. У каралеўскіх гарадах аднаўлялася самакіраванне.

Нягледзячы на прошукі магнатэрыі, Станіслаў Аўгуст увесь час свайго панавання працягваў правядзенне палітыкі рэформ. Пры ім адбыліся новыя змены ў структуры органаў дзяржаўнай улады Рэчы Паспалітай. Так, сойм 1773–1775 гг. пастанавіў утварыць Пастаянную Раду, якая складалася з караля, 18 сенатараў і 18 прадстаўнікоў шляхецкага саслоўя. Рада задумвалася як орган выканаўчай улады, што дзейнічае паміж пасяджэннямі сойма. Яна павінна была назіраць за выкананнем соймавых пастаноў, складаць законапраекты і нават разглядаць іх па даручэнні сойма. Фактычна гэты орган замяняў пастаянны ўрад Рэчы Паспалітай. Трэба, аднак, адзначыць, што Рада знаходзілася пад моцным уплывам расійскага пасла.

Пры падтрымцы караля праводзіліся іншыя рэформы, у тым ліку ў прававой сферы. У гэты перыяд вялася падрыхтоўка праекта кодэкса грамадзянскага і крымінальнага права, вядомага ў гістарычнай навуцы, як кодэкс Станіслава Аўгуста. Пры Панятоўскім было прадоўжана выданне зборніка законаў, соймавых пастаноў і іншых прававых актаў пад назвай «Валюміна легум».

Можна сцвярджаць, што Станіслаў Аўгуст Панятоўскі быў у поўным сэнсе персанажам эпохі Асветніцтва. Адпаведныя ідэалы ён усімі сіламі намагаўся ўвасобіць у грамадскім жыцці Рэчы Паспалітай. Кароль шырока падтрымліваў асвету і адукацыю. У 1765 г. была створана афіцэрская школа – кадэцкі корпус, з якога выйшлі Тадэвуш Касцюшка, Юльян Нямцэвіч, Якуб Ясінскі і многія іншыя вядомыя тагачасныя дзеячы. У 1773 г. ўтварылася Адукацыйная камісія, што па праву лічыцца першым у Еўропе міністэрствам адукацыі. У 1781 г. Віленская езуіцкая акадэмія была пераўтворана ў Галоўную школу ВКЛ.

Станіслаў Аўгуст быў вядомы як мецэнат, ініцыятар выдання прагрэсіўнага часопіса «Манітор». Клапоцячыся пра прэстыж і культурнае развіццё сваёй краіны, Панятоўскі апекаваўся тэатрам і мастацтвам. Пры яго двары былі сабраны таленавітыя мастакі і скульптары. Развівалася будаўніцтва, прычым кароль асабіста прымаў удзел у падрыхтоўцы архітэктурных праектаў. Пры каралеўскім палацы ў Варшаве была адчынена мастацкая школа. Станіслаў Аўгуст сабраў багацейшыя калекцыі жывапісу, графікі, мініяцюр, гэм і камей, манет, антычных копій. На аснове гэтых калекцый ён планаваў адчыніць нацыянальны музей. Таксама рыхтавалася адкрыццё акадэміі мастацтва, акадэміі навук і літаратуры.

Такім чынам, можна сцвярджаць, што вывучэнне дзейнасці Станіслава Аўгуста Панятоўскага навукай гісторыі дзяржавы і права Беларусі знаходзіцца на пачатковым этапе. Перспектывы адпаведнага даследавання звязаны, на нашу думку, з вывучэннем уплыву гэтага выдатнага дзеяча эпохі Асветніцтва на правядзенне палітычных і прававых рэформ у Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII ст.

## Літаратура


1. *Грыцкевіч, А. П.* Апошні кароль / А. П. Грыцкевіч // Культура. – 1994. – № 29. – С. 4–5.
2. *Мальдзіс, А. І.* Беларусь у люстэрку мемуарнай літартуры XVIII ст.: Нарысы быту і звычаяў / А. І. Мальдзіс. – Мінск, 1982. – 256 с.
3. *Понятовский, С-А.* Мемуары. Путь к трону: История дворцового переворота 28 июня 1762 года / С-А. Понятовский. – М.: Слово, 1997. – С. 265–324.
4. *Тазьбір, Я.* Партрэты ў плямах / Я. Тазьбір // Найясьнейшая Рэч Паспалітая: Цывілізацыя – Культура – Рэлігія – Палітыка – Авантура – Героіка – Успамін / саст. А. Дзярновіч. – Мінск, 2007. – С. 130–136.
5. *Шпунт, А.* «Я Бацькаўшчыны не перажыву…» / А. Шпунт // Найясьнейшая Рэч Паспалітая: Цывілізацыя – Культура – Рэлігія – Палітыка – Авантура – Героіка – Успамін / саст. А. Дзярновіч. – Мінск, 2007. – С. 266–288.
6. *Юхо, Я. А.* Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі: вучэб. дапам. / Я. А. Юхо. – Мінск, 1992. – 270 с.
7. Cudzoziemcy o Polsce: Relacje i opinie: W 2 t. / Wybrał i oprac. J. Gintel. – Krakow, 1971. – T. 2: Wiek XVIII–XIX. – 587 s.